# Занятак-прэзентацыя
# «Старажытныя гульні»
## для навучэнцаў аб’яднання па інтарэсах турысцка-краязнаўчага профіля




**Падрыхтавала: Раманькова Ірына Міхайлаўна,**
**педагог дадатковай адукацыі**

 

**Сёння з нашага занятку вы даведаецеся аб некаторых традыцыйных старажытных гульнях нашых продкаў, пазнаёміцеся з іх роляй у фізічным выхаванні, а таксама пашырыце свае веды аб тым, што народныя гульні нашых продкаў з’яўляюцца выдатным спосабам умацаваць свой дух, сваё цела, развіць працэсы мышлення, кемлівасць, спрыт.**



# Народныя гульні як сродак выхавання

* Беларускія народныя гульні – адзін з самых старажытных і арыгінальных сродкаў выхавання. Яны прыйшлі да нас з глыбінь стагоддзяў, перадаюцца з пакалення ў пакаленне і цесна звязаны з навакольным асяроддзем, бытам і працоўнай дзейнасцю людзей, раскрываюць характар, звычкі і традыцыі беларусаў. Як правіла, беларускія народныя гульні – рухомыя.
* Беларускія народныя гульні садзейнічаюць правільнаму фізічнаму развіццю, умацаванню здароўя, развіццю сілы, спрытнасці, назіральнасці, кемлівасці, удумлівасці, вытрымцы, пачуцця калектывізму, клопату пра іншых, любові да роднага краю, выхаванню пачуцця справядлівасці.





* **Народныя гульні ў спалучэнні з іншымі выхаваўчымі сродкамі ўяўляюць сабой аснову пачатковага этапу фарміравання гарманічна развітай, актыўнай асобы, якая спалучае ў сабе духоўнае багацце, маральную аснову і фізічную дасканаласць.**
* **Працэс азнакамлення з нацыянальнай культурай у цяперашні час ажыццяўляецца ў розных відах дзіцячай дзейнасці:**
* **- Гульнявая дзейнасць (народныя рухомыя гульні)**
* **- Экскурсіі ў выставачныя залы, тэатры.**
* **- Арганізацыя выстаў вырабаў нацыянальнага дэкаратыўна прыкладной творчасці**
* **- Народныя святы.**







**Народныя гульні** - гэта яркі выраз народа, які ў іх гуляе, адлюстраванне этнасу ў цэлым і гісторыі яго развіцця. У дадатку да ўсяго гэтага і выдатны спосаб умацаваць свой дух, сваё цела, развіць працэсы мышлення. Беларускі народ многія працэсы сваёй жыццядзейнасці адлюстроўваў менавіта такім чынам, праз гульню. Рухомая гульня - гэта крыніца радасных эмоцый, яна выклікае ў дзяцей пачуццё задавальнення, прывучае да ўзгодненых дзеянняў. Сюжэты гульняў спрыяюць актыўнаму руху дзяцей. У гульнях ярка адлюстроўваецца лад жыцця людзей, іх побыт, нацыянальныя асновы, кемлівасць, знаходлівасць, смеласць.







**Падахвочваючы вас да рухомай актыўнасці на прагулцы, у гульнях, мы працягваем ўмацоўваць і ахоўваць ваша здароўе. З дапамогай рухомых гульняў ствараем у ўдзельнікаў гульні радасны настрой. Але і праз народныя рухомыя гульні спрабуем прывіваць любоў да роднага краю, да свайго горада, сяла, да сваіх традыцый і звычаяў.**
**Не адно народнае свята не абыходзіцца без спартыўных спаборніцтваў, эстафет, рухомых гульняў. Яны нясуць у сабе культуру зносін, вучаць быць пільнымі, добрымі, захоўваць мясцовыя традыцыі і звычаі.**
**Пасродкам народных рухомых гульняў развіваць у дзяцей цікавасць да культурнай спадчыны свайго народа. Выхоўваць паважлівае стаўленне да ўсяго, што створана рукамі папярэдніх пакаленняў.**





**НАРОДНЫЯ ГУЛЬНІ — адна са старажытных форм народнай творчасці.** **Узніклі як вынік язычніцкіх уяўленняў чалавека пра навакольны свет і звязаны з яго імкненнем пры дапамозе магічных гульнёвых дзеянняў, імітацыі паводзін жывёл, працоўных працэсаў , паўплываць на незразумелыя прыродныя сілы.**

**З развіццём эстэтычнай функцыі, якая паступова замяніла прыктычную, народныя гульні сталі забавай, сродкам эстэтычнага, а спартыўныя гульні апошняга часу і фізічнага выхавання людзей. Найбольш старажытныя гульні звязаны з паляваннем. Яны ўзыходзяць да рытуальных скокаў, у якіх чалавек, імітуючы паводзіны жывёл і птушак, імкнуўся з магічнымі мэтамі ўвасобіцца ў іншую істоту. Гульні такога характару: «Воўк», «Каршун», «Мядзведзь», «Пастух і воўк», «Гусі», «Каза», «Галубы», «Мядзведзь», «Горліца» і іншыя.**







**Вось прыклад адной з такіх гульняў:**

## «Паляўнічыя і арол»

**Задача: развіваць трапнасць і дакладнасць удару, вакамер, хуткасць рэакцыі.**

**Апісанне гульні: усе дзеці—паляўнічыя. З дапамогай жараб'ёўкі выбіраюць вядучага — арла, яны адвольна перамяшчаюцца на пляцоўцы, перакідваючы адзін аднаму мяч, і імкнуцца выбраць зручны момант, каб лёгка ударыць мячом у спіну ці па нагах арла. Але падыходзіць да арла бліжэй, чым пяць-шэсць крокаў, не дазваляецца. Калі арол набліжаецца да паляўнічага, у якога мяч, той уцякае або аддае мяч іншаму. Калі арол зловіць мяч на ляту, ён кідае яго за межы пляцоўкі. Вяртае мяч у гульню паляўнічы, па віне якога мяч быў злоўлены арлом. Паляўнічы, якому ўдаецца падбіць арла, мяняецца з ім ролямі.**

**Правілы гульні: арол можа адабраць мяч у паляўнічага, дакрануўшыся да яго рукой.**



**Многія народныя гульні заснаваны на імітацыі працоўных працэсаў: «Проса», «Лён», «Мак», «Рэдзька», «Млынок» і іншыя, большасць з іх трансфармавалася ў гульнёвыя карагоды. Вытокі вялікай колькасці традыцыйных гульняў ляжаць у абрадавай паэзіі. Асабліва многа іх звязана з народным календаром.**





**Азнаёмцеся, калі ласка, з адной з такіх гульняў:**
**«Лянок»**
**Задача:** **практыкаваць ва ўменні ўзгадняць рухі са словамі песні. Выхоўваць пачуццё калектывізму, цікавасць да народнага фальклору.**
**Апісанне гульні: з ліку тых, хто прымае удзел у гульні, выбіраецца «бабуля». Астатнія становяцца ў круг. Яны пытаюцца:**
**— *Што ты, бабуля, нам прасці дасі?***
**Бабуля выходзіць у цэнтр круга і адказвае:**
**— *Старым бабулькам воўны пасмачку, А прыгожым маладзічкам белы лянок!***
**Пасля гэтага дзеці разам з бабуляй пачынаюць спяваць, паказваючы рухамі дзеянні, пра якія гаворыцца ў песні:**
***А мы сеялі, сеялі лянок,***
***Белы, слаўны кужалёк!***
***Урадзіся, наш лянок!***
***Урадзіся, кужалёк.***
***Мы лянок ірвалі, жалі,***
***Абразалі, у полі слалі,***
***У снапочкі збіралі.***
***Урадзіся лянок***
***Белы, слаўны кужалёк.***
**Правілы гульні:** **дзеці павінны дакладна выконваць дзеянні, якія паказвае «бабуля».**

**Своеасаблівым комплексам можна лічыць веснавыя каляндарныя гульні гуканне вясны, валачобніцтва , Юр'я, ваджэнне і «пахаванне «стралы», провады русалкі, траецкія гульні, ваджэнне куста. Шмат гульнёвых забаў адбывалася на купалле — скокі праз вогнішча. качанне па жыце, пошукі папараць-кветкі; нават выбіралі іх арганізатара — Купаліша. Гульнёвы характар у час жніва набылі цырымоніі першага і апошняга снапа, «завіванне барады». Зімой у доўгія вечары пераапраналіся ў «цыганоў», вадзілі «Казу», «Каня», «Кабылу», «Жураўля», жанілі «Цярэшку» , гулялі ў «Яшчура». Багаццем гульнёвых рытуалаў адрозніваецца вяселле, магчыма таму ў народзе часта кажуць «гуляюць вяселле». Сватаўство, абарона варот, выкуп месца для маладой, падзел каравая і іншыя дзеянні, страціўшы свой старажытны сэнс форм шлюбу, сталі вясельнымі гульнямі.**







**Падчас правядзення народных рухомых гульняў фармуецца правільная пастава, уменне выконваць рух свядома, прыгожа, хутка, спрытна. Пашыраюцца прадстаўленні пра родную краіну, пра народныя святы, з'яўляецца цікавасць да падзей у краіне, выхоўваецца любоў да Радзімы, да роднага краю, цікавасць да спорту!**





У заключэнні тэмы можна сцвярджаць з упэўненнасцю, што **народныя гульні -** гэта яркі выраз народа, які ў іх гуляе, адлюстраванне этнасу ў цэлым і гісторыі яго развіцця. У дадатку да ўсяго гэтага і выдатны **спосаб умацаваць свой дух, сваё цела, развіць працэсы мышлення.** Беларускі народ многія працэсы сваёй жыццядзейнасці адлюстроўваў менавіта такім чынам, праз гульню. Рухомая гульня - гэта крыніца радасных эмоцый, яна выклікае ў дзяцей пачуццё задавальнення, прывучае да ўзгодненых дзеянняў. Сюжэты гульняў спрыяюць актыўнаму руху дзяцей. У гульнях ярка адлюстроўваецца лад жыцця людзей, іх побыт, нацыянальныя асновы, кемлівасць, знаходлівасць, смеласць.







# Дамашняе заданне:

**Напішыце міні-сачыненне на тэму: ”Гульні дзяцінства маіх бабуль і дзядуль “. Апішыце адну з гэтых гульняў падрабязна, не забуудзьце пазнаёміць нас з правіламі гульні.**

**Свае лісты вам неабходна накіраваць на viber педагога  і не забыць напісаць сваё прозвішча, імя, назву аб’яднання па інтарэсах.**

**Жадаем поспехаў!**

# ДЗЯКУЕМ ЗА УВАГУ!!!


MyShared